# Экалогіі без геаграфіі не бывае

**Беларускае геаграфічнае таварыства (БелГТ) як грамадска-навуковая арганізацыя існуе ўжо 70 гадоў. Аднак яго вытокі бяруць свой пачатак яшчэ з сярэдзіны XIX стагоддзя.**

**Шмат таленавітых і сусветна вядомых вучоных выйшлі з шэрагаў арганізацыі, асноўная місія якой - папулярызацыя ведаў аб геаграфіі. Паводле слоў старшыні таварыства Аляксея ЯРОТАВА, яно заўсёды займалася праблемамі экалагічнай і геаграфічнай адукацыі.**

Таварыства як некамерцыйная арганізацыя аб’ядноўвае ў сваім складзе экспертаў (сёння ў БелГТ 350 членаў) у розных галінах ведаў, звязаных з геаграфіяй і прыродаахоўнай дзейнасцю, - расказаў Аляксей Яротаў. Дарэчы, адзін з найбуйнейшых праектаў таварыства – распрацоўка Канцэпцыі экалагічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на перыяд 2020-2025 гадоў.

Немалаважную ролю ў дзейнасці арганізацыі займае і работа з моладдзю. Так, члены БелГТ рэгулярна выступаюць у якасці журы ў разнастайных экалагічных конкурсах. Асобна варта сказаць пра алімпіядны рух.

- Школы падрыхтоўкі дзяцей да алімпіяд фарміруюць патэнцыял, які закладваецца ў школьніках і ў перспектыве нашых будучых студэнтах, - адзначыў Аляксей Яротаў.

У гэтым напрамку БелГТ мае прыемныя навіны. Так, у жніўні беларускія школьнікі пад кіраўніцтвам першага прарэктара Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (БДУ) Дзмітрыя Курловіча і дэкана факультэта геаграфіі і геа-інфарматыкі Алены Кальмаковай заваявалі тры залатыя, адзін сярэбраны і два бронзавыя медалі на XVII Міжнароднай алімпіядзе па навуках аб Зямлі ў Пекіне. Такога значнага поспеху беларуская каманда дабілася ўпершыню.

## Яркія праекты

БелГТ мае шэраг перспектыўных адукацыйных праектаў. Некаторыя ўжо рэалізаваны, астатнія рыхтуюцца да ўвасаблення ў жыццё ў бліжэйшы час. Так, з мінулага года на базе БДУ пачалі праводзіць асветніцкую акцыю «Беларуская геаграфічная дыктоўка».

- Гэта цікавае мерапрыемства і вельмі добрая папулярызацыйная акцыя. Дыктоўка складаецца з шэрагу пытанняў з каляровымі малюнкамі, у якіх адлюстравана аўтэнтычнасць Беларусі, яе сацыяльна-эканамічныя, культурныя, лінгвістычныя, этнічныя асаблівасці. Важна тое, што для ўдзелу ў гэтай акцыі няма ніякіх узроставых абмежаванняў. На маёй памяці, самым юным удзельнікам стаў пяцігадовы хлопчык, які прыйшоў з 72-гадовай бабуляй, выпускніцай геаграфічнага факультэта 1952 года, - падкрэсліў Аляксей Яротаў.

Дарэчы, сёлета да геаграфічнай дыктоўкі далучыліся беларусы з Казахстана, Сербіі, Паўднёвай Амерыкі, Кітая, Харватыі. Усяго за два гады правядзення акцыі ў ёй паўдзельнічалі больш за 5 тыс. чалавек.

Безумоўна, варты ўвагі і фэст-кірмаін «Магія дзяцінства».

- У 2024 годзе ў Беларускае геаграфічнае таварыства звярнуўся Мінскі міжнародны жаночы клуб жонак паслоў, дыпламатаў і замежных прадстаўнікоў. Яны прапанавалі сумесна з факультэтам геаграфіі і геаінфарматыкі БД У стварыць алею БелГТ у парку імя Максіма Горкага да Дня абароны дзяцей. Нам выдзелілі месца, дзе мы размясцілі шмат цікавага. Напрыклад, можна было азнаёміцца з нашай літаратурай, праверыць акуляры на прапусканне ўльтрафіялетавага выпраменьвання, прайсці геалагічны квэст і атрымаць у якасці прыза кавалачак беларускага бурштыну або кварца, знойдзенага ў Мікашэвічах, - адзначыў старшыня БелГТ. - Да нас прыйшлі некалькі тысяч чалавек, і мы вырашылі, што ў 2025 годзе зробім тэта свята яшчэ больш цікавым і маштабным.

А вось дыстанцыйную школу па геалогіі

плануюць рэалізаваць ужо ў гэтым годзе.

Паводле педагагічнай псіхалогіі, інфармацыю, атрыманую ад прафесара, якому 50 60 гадоў, школьнік будзе ўспрымаць вельмі апасродкавана. А веды, што транслюе прафесар маладому выкладчыку, той - студэнту, а студэнт - школьніку, значна хутчэй засвойваюцца і выклікаюць цікавасць, - падзяліўся Аляксей Яротаў. - Дыстанцыйная школа накіравана на тое, каб у Верхнядзвінскім раёне (там, у вёсцы Валынцы, знаходіцца школа імя І. Д. Чэрскага, вядома- га географа і геолага) выявіць матываваную моладзь, зацікаўленую ў геаграфіі і геалогіі. Нашы магістранты некалькі разоў у месяц будуць праводзіць дыстанцыйныя заняткі. Калі збярэцца 15-20 навучэнцаў школы, то можа быць арганізаваны летні лагер, у які будуць запрошаны нашы студэнты-геолагі ў якасці ментараў.

Зараз распрацоўваем яшчэ адзін цікавы праект: у геалагічным музеі БДУ штогод праводзіцца выстава «Не камяні» - мы збіраемсяператварыць яе ў палявую школу. Пашырыць і неранесці на ад-крытую прастору, напрыклад, ва ўнутраны дворык БДУ, запрасіць школьнікаў для заняткаў. Ёсць, вядома, і больш маштабныя задумка Але для іх трэба адпаведнае фінансаванне.

**Юбілейныя падарункі**

Сёлета БелГТ адзначыла сваё 70-годдзе. Нядзіўна, што да гэтай круглай даты было падрыхтавана шмат цікавых праектаў і выставак.

- У нас прайшоў першы геаграфічны кангрэс сусветнага маштабу. Правялі адразу пяць геаграфічных выставак у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, Нацыянальным гісторыка-культурным музеі - запаведніку «Нясвіж», Музеі-сядзібе «Пружанскі палацык». Там можна было ўбачыць працы географаў - ад 1917 года і па сённяшні час, выставу геаграфічных карт Вялікага Княства Літоўскага і Беларусі і шмат іншых цікавых рэчаў. Таксама мы паказалі тыя геадэзічныя прыборы, пры дапамозе якіх было пабудавана метро, сама бібліятэка, - падзяліўся Аляксей Яўгенавіч.

Асобна варта сказаць пра фота- выставу «Жывыя камяні Антарктыды», якая экспанавалася вясной у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусь Па дамове з кіраўніком Беларускай Антарктычнай экспедыцыі Аляксеем Гайдашовым, БелГТ атрымала больш за 60 фота і 13 фільмаў пра Антарктыду амаль за 25 гадоў.

- Назва выставы адлюстроўвае экалагічныя аспекты таго, што чалавек можа зрабіць з навакольным асяроддзем, калі трайіць у крохкую і недаступную прастору Антарктыды. Мы хацелі паказаць суровыя ўмовы, унікальныя ландшафты і геалагічную гісторыю, што вывучалі нашы даследнікі. Так, Юрый Пгіняк сабраў калекцыю фатаграфій з пачатку 1970-х гадоў. На гэтай выставе нават ёсць кадр, зроблены ўнутры айсберга, - падзяліўся старшыня БелГТ, які і сам удзельнічаў у арганізацыі дзвюх апошніх экспедыцый:

- Па абавязку службы я камандзірую супрацоўнікаў свайго падраздзялення ў экспедыцыю. Звычайна яна складаецца з 15- 17 чалавек, якія праводзяць там паўгода. Менавіта ў Антарктыдзе і Арктыцы найболын выразна бачныя глабальныя экалагічныя змсны.

Паводле яго слоў, камяні на фатаграфіях вельмі чорныя, абпаленыя сонечным святлом. Уся справа ў тым, што ў Антарктыдзе параметр УФ-выпраменьвання 11-12, а ў нас усяго 4-6. Тэта да- памагае даведацца пра біялагічнае жыццё ва ўмовах азонавай дзіркі.

Адным словам, звесткі, атрыманыя ў Антарктыдзе, бясцэнныя. Магчыма, менавіта яны дапамогуць чалавецтву своечасова зрабіць крок насустрач прыродзе.

**Лізавета ГОЛАД**